№№162–163 (2473–2474)

12 кастрычніка 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

По пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

Неприкасаемые?

Или сможет ли генеральный прокурор возбуждать уголовные дела против "лиц определенных категорий" без согласования с президентом страны?

Начальник пресс-службы президента Беларуси Павел Легкий не подтвердил информацию о якобы подписанном главой государства указе, который утвердил положение об особом порядке привлечения к уголовной ответственности некоторых категорий должностных лиц. "Я не видел такого документа", — сказал П.Легкий.

Сообщения о новом нормативном правовом акте появились на некоторых интернет-ресурсах. Речь идет о том, что создан список должностей, в отношении которых можно начинать уголовное преследование только с разрешения главы государства. Якобы кроме депутатов и судей, в список попали глава Администрации президента, его заместители, начальники управлений, премьер-министр, его заместители, председатели районных, областных и Минского городского исполкомов, руководители прокуратуры, начиная от областного уровня (прокуроры района этой привилегией не наделены), госслужащие, занимающие должность ранга министра и его заместителей, а также все без исключения руководители и заместители руководителей силовых структур (МВД, КГБ, Департамента финансовых расследований КГК, Совета безопасности, ГТК, Госкомитета погранвойск, Минобороны, Службы безопасности президента), начальники УВД всех областей и ГУВД Мингорисполкома.

В то же время, как сообщил БелаПАН начальник управления правового обеспечения, информации и общественных связей Прокуратуры Республики Беларусь Андрей Швед, на прошлой неделе в этом ведомстве находился на согласовании проект закона, подготовленный Администрацией президента, "О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросу уголовного преследования отдельных категорий лиц". Законопроект предполагает, в частности, дополнение Уголовно-процессуального кодекса отдельной главой, определяющей порядок особого производства, связанного с возбуждением уголовных дел в отношении определенного перечня лиц. Это касается высших должностных лиц государства, лиц из кадрового реестра президента, депутатов, судей и прокурорских работников. Законопроект устанавливает, что в отношении представителя этих категорий граждан уголовное дело может быть возбуждено только генеральным прокурором с согласия лица, назначившего этого человека на занимаемую должность.

ОТ РЕДАКЦИИ

Здесь скорее всего тот случай, когда говорят: "Дыма без огня не бывает". Какая разница, о каком документе идет речь — об Указе президента или о внесении изменений в закон. Важен факт — почему не все граждане страны равны перед Конституцией? Почему правоохранительные органы против одних лиц могут возбуждать уголовные дела по своему усмотрению, а против "президентских кадров" — только по согласованию с ним? Вы можете представить такую ситуацию, скажем, во Франции: генеральный прокурор спрашивает у президента, может ли он возбудить уголовное дело против некоего мэра или нет? Случись такое — в течение суток полетели бы со своих должностей и первый, и второй.

Но это во Франции. А что будет в Беларуси — посмотрим. В любом случае информацию начальника управления правового обеспечения, информации и общественных связей прокуратуры страны Андрея Шведа не может не встревожить общественность.

МІНСК—МАСКВА

Беларускі рэжым для Расіі стаў непрыязным?

У расійска-беларускіх адносінах склалася крытычная сітуацыя. Пра гэта заявіў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін на сустрэчы з лідэрамі фракцый Дзяржаўнай думы.

"Атрымалася змястоўная размова. Мы абмяркоўвалі шырокае кола праблем — не толькі па Каўказе, але і па расійска-беларускіх адносінах. Усе пагадзіліся з тым, што сітуацыя склалася крытычная", — згадвае словы віцэ-спікера Дзяржлумы Сяргея Бабурына інтэрнэт-рэсурс "Страна.ru".

Паводле слоў С.Бабурына, расійскі кіраўнік папрасіў лідэраў фракцый *"прыняць закон, які дазваляе прэзідэнту ўводзіць спецыяльны рэжым у дачыненні да недружалюбных Расіі краін". "Гэта будзе калька з амерыканскага закона, які цяпер дзейнічае ў дачыненні да Беларусі"*, — патлумачыў віцэ-спікер, маючы на ўвазе прыняты Кангрэсам ЗША ў 2004 годзе Акт аб дэмакратыі ў Беларусі.

Зараз Мінск і Масква вядуць спрэчкі наконт цаны на расійскі газ у 2007 годзе, стварэння сумеснага прадпрыемства на базе "Белтрансгазу", прыняцця Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы, уваядзення адзінай валюты. Нагадаем, што Аляксандр Лукашэнка выступіў з шэрагам жорсткіх заяў у адрас Расіі 29 верасня ў ходзе прэс-канферэнцыі для журналістаў расійскіх рэгіянальных СМІ.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ПАЛІТКУХНЯ

Вячаслаў ОРГІШ, доктар філасофскіх навук

Зручны міжсабойчык

Аб тым, куды хіляць партыйныя разумнікі

Шматгадовыя спробы беларускіх дэмакратаў прыйсці да ўлады і развярнуць Беларусь у бок Захаду, далучыць яе да Еўрапейскага Саюза, на вялікі жаль, не маюць поспеху. Апошнія прэзідэнцкія выбары толькі пацвердзілі гэты сумны факт. Больш відавочна стала тое, што справа не толькі ў жорсткасці рэжыму. Сама арганізаваная апазіцыя, каб быць выніковай, мае патрэбу ў рэфармаванні. Ёй нестае шырокай сацыяльнай базы, даверу і падтрымкі з боку найбольш уплывовых груп насельніцтва. Яна ніяк не можа пераадолець манаполію партыйнага ўплыву з боку жменькі, мякка кажучы, не надта паспяховых палітычных структур, што ў значнай ступені абмяжоўвае яе электаральную прывабліваць і цалкам задавальняе "Чырвоны дом".

Вясновая палітычная кампанія, тое, як дзейнічала ў ёй кіраўніцтва аб'яднаных дэмакратычных сіл, дало беларускай грамадскасці падставу для высновы аб тым, што дэмакратычнаму руху краіны па-ранейшаму не хапае смелых харызматычных лідэраў і эфектыўных палітычных менеджэраў. А стратэгічная дактрына занадта абстрактная, дрэнна стасуецца з патрабаваннямі часу, не паспявае за палітычнымі выклікамі еўрапейскага жыцця. Таму амаль адразу пасля 19 сакавіка пачалі гучаць патрабаванні арганізаваць "разбор палётаў", абмеркаваць стратэгію далейшай барацьбы і ў той ці іншай форме вярнуцца да пытання аб персоне палітыка, які надалей будзе першым нумарам сярод дэмакратаў. Як вынік з'явілася прапанова склікаць новы Кангрэс дэмакратычных сіл. У якім стане гэта прапанова зараз? Як трэба падысці да пытання аб персоне першага нумара, каб высокі дэмакратычны сход (калі такі адбудзецца) знайшоў на яго перспектыўны для справы беларускай дэмакратыі адказ?

Працаўнікі і прыхільнікі ідэі

Прайшло больш за шэсць месяцаў з таго часу, як стала зразумела, што дэмакратычная грамадскасць краіны ў чарговы раз засталася ні з чым. За гэты перыяд ідэя правядзення новага Кангрэса дэмакратычных сіл, аб мэтазгоднасці якога неаднойчы пісалася на старонках "Народнай волі", значна памацнела і, здаецца, паступова прабівае сабе шлях. Але ў якім выглядзе і наколькі канструктыўна збіраюцца яе выкарыстоўваць сілы, якія гатовы ўзяць на сябе ініцыятыву правядзення адказнага палітычнага мерапрыемства? Якія праблемы хаваюцца за гульнямі вакол яго арганізацыі?

Калі ўпершыню прагучала думка аб неабходнасці склікання чарговага Кангрэса, шмат хто сярод кіраўніцтва Аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС) сустрэў яе ў штыкі. Найперш гэта экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч, якога Кангрэс 2005 года абраў адзіным дэмакратычным кандыдатам на мінулых прэзідэнцкіх выбарах (ён, хоць і з цяжкасцю, але пакуль працягвае захоўваць майку лідэра АДС). А таксама партыйны лідэр Вінцук Вячорка, партыя якога (БНФ) была галоўнай натхняльніцай і палітычным куратарам праекта "Аляксандра Мілінкевіча — у прэзідэнты Беларусі!".

Працаўнікі ідэі правядзення новага з'езда дэмакратаў лічаць, што падрыхтоўка да мерапрыемства адцягне ўвагу апазіцыйных структур ад работы з насельніцтвам, да часу ўзрушыць амбіцыі палітыкаў і груповак, якія хацелі б вярнуцца да пытання аб адзіным лідэры аб'яднанай апазіцыі. Прыхільнікаў захавання статус-кво можна зразумець. Пэўная частка іх, калі ўжо казаць адкрытым тэкстам, не для таго змагалася ў 2005 годзе за ключавыя пазіцыі ў дэмакратычным лагеры, каб рызыкаваць імі (альбо ўвогуле страціць) у ходзе падрыхтоўкі і правядзення новага форума, на якім, як няцяжка спрагназаваць, непазбежна ўзнікне пытанне справаздачы па выніках мінулай палітычнай кампаніі. І, вельмі верагодна, пачнецца пошук новых лідэраў.

Карацей кажучы, з пункту гледжання крытыкаў ідэі, зараз не тая сітуацыя, каб праводзіць вялікі дэмакратычны сход. Саспее палітычная сітуацыя (скажам, наблізяцца наступныя прэзідэнцкія выбары), тады і мэтазгодна ладзіць Кангрэс. А пакуль трэба рыхтавацца да мясцовых выбараў ды рэалізоўваць тую стратэгічную лінію, якая "паспяхова" спрацавала падчас сакавіцкай выбарчай кампаніі.

Пакінем апошні тэзіс на сумленні яго аўтараў. У рэшце рэшт гаворка аб іншым. Аб тым, у прыватнасці, што прыхільнікі правядзення Кангрэса ўпарта прасоўваюцца наперад. Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька на мінулым Кангрэсе дэмсіл быў асноўным сапернікам Аляксандра Мілінкевіча, для перамогі яму не хапіла якога-небудзь дзесятка галасоў. Сення ён прынцыпова выступае за скліканне дэмакратычнага форума, мае ў гэтым нарастаючую падтрымку. Прынамсі, яго настроі падзяляе Сяргей Калякін (былы кіраўнік штаба экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча, лідэр Партыі камуністаў беларускай), на думку якога "правядзенне Кангрэса — гэта адзіны спосаб не дапусціць, каб кааліцыя памерла".

Спроба ўзяцца за старое

А Віктар Івашкевіч (намеснік старшыні Партыі БНФ) увогуле прапанаваў неадкладна разгарнуць падрыхтоўчую работу да Кангрэса. Дзе гэта бачна, разважае палітык, каб армія шукала генерала на ролю палкаводца напярэдадні баталіі? Таму дэмакратычны форум трэба збіраць, не чакаючы крытычнай сітуацыі, аднак падрыхтоўку да яго неабходна спалучыць з падрыхтоўкай да мясцовых выбараў.

Выпадкова ці не, але гэта палітычная ініцыятыва перасеклася з іншай, у выніку чаго дэмакратычная апазіцыя можа забіць двух зайцоў адразу. Справа ў тым, што 21 верасня Палітсавет АДС разам з Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыяй (Грамада) прыняў за аснову план удзелу апазіцыі ў мясцовых выбарах і рэарганізацыі структур АДС. Падмуркам гэтага плана стане нацыянальнае пасланне да беларускага народа, якое належыць выпрацаваць экспертам бакоў.

З гэтага прынятага за аснову плана вынікаюць дзве прынцыповыя рэчы. Па-першае, БСДП (Г), якая ўдзельнічала ў мінулых прэзідэнцкіх выбарах асобнай калонай, пачынае дзейнічаць (хочацца ў гэта верыць) у накірунку большага аб'яднання дэмакратычнага руху. Па-другое, мяркуецца, што Палітсавет АДС і БСДП (Г) разам правядуць Кангрэс дэмсіл краіны. На сваім апошнім пасяджэнні 6 кастрычніка Палітсавет АДС у развіццё ініцыятывы прыняў праект пагаднення аб рэарганізацыі руху. Лідэры кааліцыі ўжо спрачаліся не гэтулькі вакол пытання аб правядзенні Кангрэса, колькі аб яго мэтах.

Відавочна, на гэтым можна было б ставіць тлустую кропку. Калі б не падрабязнасці падрыхтоўкі да адказнейшага палітычнага мерапрыемства. Д'ябал, як даўно заўважана, хаваецца менавіта ў падрабязнасцях. Таго, хто больш уважліва пазнаёміцца з прынятым за аснову планам Палітсавета АДС і БСДП (Г), хутчэй за ўсё чакае здзіўленне. Прапанаванае ў ім пакідае ўражанне нейкай спробы стварыць перадумовы для рэанімацыі старой і спрэчнай схемы рашэння найбольш вострага і актуальнага для апазіцыі пытання. Схемы, якая задавальняе вузкакарпаратыўныя інтарэсы партыйных эліт і мала дадае да таго, што ўжо праходзілі.

З чаго вынікае такая радыкальная выснова?

(Заканчэнне на 2-й стар.)

СЛЫШАЛИ?

Ермошина не сдается...

Она может возглавить Центральную избирательную комиссию еще на пять лет

В некоторых СМИ появилась информация о том, что председатель Центризбиркома Лидия Ермошина собирается стать послом Беларуси в Молдове: "Даже главе белорусского ЦИК Л.Ермошиной уже не сидится в Минске — просится послом в Кишинев".

Насколько это верно, я выяснил у самой Ермошиной.

— Нет, я никуда не просилась, — сказала глава ЦИК. — Более того, могу сообщить, что совместным постановлением Могилевских облисполкома и облсовета я в третий раз выдвинута в состав Центральной избирательной комиссии.

Закон о ЦИК определяет срок полномочий комиссии — пять лет. Он истекает именно через этот промежуток времени, а отсчет идет с момента формирования комиссии в правомочном составе. Последний раз это было 31 января 2002 года, так что нынешний состав комиссии сложит свои полномочия 31 января 2007 года. Поэтому по поручению главы государства мы обратились в областные исполкомы с просьбой представить кандидатов в новый состав ЦИК. И вот могилевчане остановились на моей кандидатуре.

Действующая Конституция предусматривает: шесть членов ЦИК назначает президент, еще шесть избирает Совет Республики. Он же дает согласие на назначение председателя ЦИК.

— И все же часто говорят: дыма без огня не бывает. Может, не Вы просились, а Вам предлагали посольскую должность?

— Нет, мне никто ничего подобного не предлагал и не предложит. Почему? Да потому, что должность посла, особенно в странах СНГ, — это скорее должность хозяйственная. И в основном туда назначаются бывшие хозяйственные руководители — те, кто имеет определенные связи и может налаживать внешнеэкономическую деятельность. Поэтому, я думаю, вряд ли кому-либо даже пришла в голову мысль предложить мне подобную должность. Просто невероятно!

Досье

Лидия Ермошина родилась в Слуцке. Закончила Калининградский университет. Осенью 1996 года, после того как Александр Лукашенко вероломно сместил с должности председателя ЦИК Виктора Гончара, заняла вакантное место. С тех пор бессменно возглавляет ЦИК. Она входит в список 36 представителей белорусских властей, против которых введены ограничительные меры и экономические санкции Евросоюза. Возможно, по этой причине свой очередной отпуск Лидия Михайловна провела в Сочи в санатории "Беларусь", где ей, по ее словам, понравилось куда больше, чем в Турции.

Владимир ГЛОД.

У рэдакцыю "Народнай волі"

Паважаны рэдактар "Народнай волі" І.П.Сярэдзіч!

Дазвольце мне праз Вашу газету выказаць шчырую падзяку ўсім добрым людзям, якія павіншавалі мяне з 75-годдзем.

Ніл ГІЛЕВІЧ.

BRITISH GOVERNMENT CHEVENING SCHOLARSHIPS FOR BELARUS: OPEN COMPETITION

The British Government's Chevening Scholarships, which are managed by the British Council, provide opportunities to undertake postgraduate study or research in the UK for between 3 and 12 months. Flights, course fees and living costs are all covered in full. Further background on the scheme can be found at www.chevening.com.

Scholarships are available for the academic year 2007/2008, and will be awarded through open competition, in the following subject areas:

- **Environment and Sustainable Development (including human rights)**
- **Justice and Home Affairs (including combating corruption and fighting illegal migration & trafficking)**
- **Economic Policy & Reform (including public administration)**
- **International Relations, Politics & Media Studies**

Successful candidates should be outstanding professionals in their field, have excellent written and spoken English, be aged under 35, have a first degree (Diploma) and be citizens of Belarus.

Application forms and further background information can be obtained from the British Embassy in Minsk (Karl Marx Street 37, Minsk 220030; tel. 017 2105920), or downloaded from the British Council Ukraine website at: *www.britishcouncil.org.ua*

Completed application forms must be returned to the British Council in Ukraine (4/12 Hryhoriya Skovorody St, Kyiv, Ukraine 04070; tel: 044 490 5600) by the deadline indicated below. If submitting the form by post, the deadlines apply to the date of receipt at the British Council, not the date of the postmark. *A copy of the completed application form should be sent to the British Embassy in Minsk* (at the above address) by the same deadline. Faxed and e-mailed application forms will not be accepted.

Other supporting documents (copies of diploma, references, transcripts) should not be attached to the application form. Candidates may be required to submit them at a later date.

The closing date for receipt of completed application forms at both the British Council in Kiev and British Embassy in Minsk is Wednesday 20th December 2006. Those applicants who have been successful after the initial assessment process will be invited for an interview at the British Embassy in Minsk during February 2007.

Those not selected for interview will be informed in writing by 20th March, 2007.

Successful candidates will be required to take an English language exam (IELTS), and will be informed of the final results by 31st March 2007.

No documentation submitted can be returned to the applicant.

For further information, please contact:
Maria Zakharova, Projects Manager
The British Council, 4/12 Hryhoriya Skovorody St, Kyiv 04070; tel +380 44 490 5600
E-mail: Maria.Zakharova@britishcouncil.org.ua

ВЯЛІКАЯ ПАЛІТЫКА

Саміт перанесены. Лукашэнка незадаволены

Аляксандр Лукашэнка паведаміў, што саміт СНД, які быў запланаваны на 17 кастрычніка і павінен быў прайсці ў Мінску, перанесены. Арыенціровачна — на канец лістапада.

Лукашэнка вельмі не задаволены гэтым фактам. *"Сёння назіраецца тэндэнцыя, калі асобныя краіны СНД лічаць сябе дзяржавамі першага сорту. Яны дасылаюць ноты з прапановай перанесці саміт на канец лістапада"*, — заявіў Лукашэнка. На ягоную думку, гэта якраз сведчыць аб недахопах Садружнасці.

Беларускія палітолагі адразу выказалі здагадку, што Лукашэнка меў на ўвазе Расію, якая спрабуе дамінаваць на постсавецкай прасторы. Зразумела, што Лукашэнку гэта не даспадобы. Ну а Расіі зараз не да таго, каб вельмі думаць пра магчымую рэакцыю беларускага лідэра.

Алена НОВІКАВА.

РАЗВАРОТ

«Ніякай саюзнай дзяржавы»

Паводле агенцтва Інтэрфакс, віцэ-спікер Дзяржлумы Расіі Уладзімір Жырыноўскі супакоіў дэпутата расійскага парламенту ад фракцыі камуністаў Анатоля Локаця наконт далейшага лёсу саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. *"Ніякай саюзнай дзяржавы ніколі не будзе, хто хоча, — хай уступае ў Расійскую Федэрацыю"*.

Анатоль Локаць цікавіўся, чаму Расія адхіліла беларускі варыянт Канстытуцыйнага акту і чаму цэны на газ для Беларусі на наступны год прапануецца павялічыць у чатыры разы, што ўдвая больш, чым для Грузіі.

Ул.інф.

КОШТЫ

Нас чакае «мабільнае» падаражанне?

З 8 снежня мабільныя тэлефоны могуць падаражэць на 18 працэнтаў.

Зараз на слыху інфармацыя аб тым, што органы дзяржкіравання Беларусі абмяркоўваюць меры па рэгуляванні ўвозу мабільных тэлефонаў (вывучаецца магчымасць кантролю за мабільнымі тэлефонамі з дапамогай IMEI-кода, які мае кожны тэлефон), а ў Беларусі "мабільнікі" ўключаны ў спіс тавараў, якія з 7 снежня 2006 года будуць маркіравацца спецыяльнымі кантрольнымі знакамі.

Калі адпаведная пастанова Савета міністраў уступіць у сілу, паўлегальныя гандляры мабільнымі тэлефонамі (а такіх значная большасць) павінны будуць заплаціць 18 працэнтаў падатку на дабаўленую вартасць, якія хутчэй за ўсё і закладуць у кошт "мабілы" пры продажы.

Дарэчы, па інфармацыі Міністэрства па падатках і зборах, за той перыяд, калі да мабільнай сувязі ў Беларусі падключыліся 2 мільёны 400 тысяч чалавек, афіцыйна ў краіну было ўвезена толькі 192 тысячы мабільных тэлефонаў.

Алесь СІВЫ.

ПАЛІТКУХНЯ

Зручны міжсабойчык

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Першы плануемы сумесны крок АДС і БСДП (Г) скіраваны на ўзгодненае правядзенне выбарчай кампаніі ў мясцовыя органы ўлады. Супольна ствараюцца паралельныя дзяржаўным выбарчыя камісіі. Апошнія каардынуюць і рэгулююць працэс вылучэння адзіных дэмакратычных кандыдатаў, праводзяць іх рэгістрацыю. Прэтэндэнты, абапіраючыся на партыйныя рэсурсы, павінны сабраць у сваю падтрымку не менш за 300 подпісаў выбаршчыкаў. Той, хто збярэ подпісы, але не будзе зарэгістраваны выбарчай камісіяй, атрымае статус назіральніка.

Што тут казаць? Арыгінальная задума. Але ж яе звышзадача ў іншым. Пасля выбараў усе кандыдаты, назіральнікі, якія збяруць па 300 і болей подпісаў, згодна са сцэнарыем сп. Івашкевіча, аўтаматычна пераходзяць у разрад... дэлегатаў будучага Кангрэса. На ім мяркуецца абраць Палітсавет АДС, яго старшыню, які фактычна апране майку дэмакратычнага лідэра, прыняць стратэгічную праграму. Яшчэ на апошнім пасяджэнні Палітсавета паступіла прапанова стварыць на дэмакратычным сходзе калектыўны орган, які будзе каардынаваць работу аб'яднанай апазіцыі.

Контрпрадуктыўныя тэндэнцыі

Цяпер зразумела, куды хіляць партыйныя разумнікі? Уявім сабе, што новы Кангрэс сабраўся, яго дэлегаты вызначаны па формуле сп.Івашкевіча. Гэта значыць, што пад наглядам і на сродкі трох-чатырох партый пэўная колькасць партыйцаў альбо партыйных прыхільнікаў сабрала па трыста подпісаў і такім чынам утварыўся асноўны склад дэлегацкага корпуса.

За каго гэтыя дэлегаты пададуць свае галасы, калі паўстане пытанне аб лідэры? Смешнае пытанне, у дадзеным выпадку спіс бясспрэчных фаварытаў можна скласці з дакладнасцю, як кажуць, да міліметра, да кропкі з коскай. У ім мы зноў убачым усё тых жа Калякіна, Лябедзьку, Мілінкевіча... Яшчэ партыйныя рэжысёры могуць абмеркаваць і дапусціць у спіс кандыдатуру зняволенага лідэра БСДП (Г) Аляксандра Казуліна, але наўрад ці гэта будзе яго свята...

Фактычна за прапановамі кшталту зробленых сп.Івашкевічам хаваюцца спробы ўтрымаць дэмакратычную апазіцыю ў вузкім старым калідоры партыйных уяўленняў і амбіцый, якія падчас мінулай палітычнай кампаніі абумовілі (сярод іншага) вельмі сціплыя вынікі дэмакратаў. **Падыход, які прапануецца да рэалізацыі пад шыльдай падрыхтоўкі новага Кангрэса, па сутнасці ёсць спроба арганізаваць пераразмеркаванне партфеляў (і, адпаведна, рэсурсаў) у кіраўніцтве АДС сярод усё таго ж вузкага кола партыйна-палітычнай эліты, якое складаюць штабы некалькіх апазіцыйных партый. У нейкім сэнсе гэта нагадвае тое, што адбываецца ў алігархічным асяроддзі некаторых постсавецкіх краін.** Уладная групоўка набівае кішэні. Другая групоўка, не задаволеная гэтым, прарываецца да ўлады і пачынае пераразмеркаванне капіталаў на сваю карысць. А ў эканамічным і сацыяльным жыцці істотна нічога не мяняецца. Улада і асноўныя капіталы цыркулююць у межах вузкага кола адных і тых жа палітыкаў і алігархаў.

Як бы ні было для кагосьці крыўдна, неабходна сказаць праўду. У кіруючых колах апазіцыі праяўляюцца і набіраюць моц контрпрадуктыўныя тэндэнцыі, назіраюцца спробы закансерваваць збанкрутаваныя, але зручныя для партыйнага начальства, падыходы да вырашэння набалелых пытанняў. Разам з тым цяжка пазбавіцца ўражання, што матывы гэтых контрпрадуктыўных тэндэнцый і спроб у пэўнай ступені звязаны з імкненнем некаторых палітыкаў захаваць доступ да крыніц фінансавання апазіцыйнай дзейнасці.

Наменклатуру адправілі ў адпачынак

У 2005 годзе справу аб'яднання дэмакратычных сіл ды пошуку "адзінага" цвёрда ўзялі ў свае рукі палітычныя партыі, ды так узялі, што ўсе астатнія апынуліся за бортам працэсу. Згадваецца, як на пачатку прэзідэнцкай кампаніі (працэс падбору "адзінага" толькі разгортваўся) выказваўся старшыня Партыі БНФ Вінцук Вячорка. Маўляў, наменклатурныя кадры няхай адпачываюць. У іх была магчымасць зрабіць гульню ў 2001 годзе. Зараз ініцыятыву возьмем мы (палітычныя партыі), мы будзем дыктаваць парадак і ўмовы гульні на апазіцыйным полі.

Знаёмы водаправодчык Паша, які дагэтуль вельмі хваравіта ўспрымае тое, як вырашалася галоўнае пытанне мінулага Кангрэса, на мой погляд, выказаў не надта дыпламатычную, але не пазбаўленую горкай праўды думку: партыйным правадырам удалося стварыць не столькі шырокую кааліцыю, колькі **"пракруціць зручны для большасці з іх міжсабойчык"**.

"Пяцёрка плюс" так сфармулявала ўмовы спаборніцтва за майку "адзінага", што рэальна прэтэндаваць на яе маглі толькі партыйныя правадыры ды іх стаўленікі. Абласныя канферэнцыі праходзілі пад кантролем апазіцыйных партструктур і пры ўдзеле пераважна партыйцаў. Дэлегацкія квоты на Кангрэс размеркаваліся паміж асноўнымі партыямі і іх прыхільнікамі з грамадскага сектара. Партыя БНФ, ОГП, ПКБ, БСДГ пры актыўным удзеле "Рэсурсных цэнтраў" (грамадскай арганізацыі, якая аказвала матэрыяльную падтрымку дэмакратычнаму руху) разыгралі галоўны прыз паміж сваімі вылучэнцамі.

Выгляд жа зрабілі, быццам у розыгрышы брала ўдзел уся дэмакратычная грамадскасць. Але ж людзі ў сваёй большасці разумелі, што на самай справе выбар за іх зрабілі партыйныя камбінатары. Пры тым, што падтрымка партыйных структур з боку насельніцтва знаходзіцца, як сведчаць сацыялагічныя даследаванні, у межах трох-пяці працэнтаў, можна смела сцвярджаць: рэалізаваны кааліцыяй падчас мінулай кампаніі сцэнарый на самай справе не прывёў да аб'яднання дэмакратычных сіл краіны вакол постаці "адзінага". Апазіцыйныя партыі саманадзейна ўзяліся за задачу, для самастойнага вырашэння якой ім неставала (і ўсё яшчэ нестае) дастатковага маральнага аўтарытэту і шырокага палітычнага ўплыву.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

ДАЖЫНКІ-2006

У панядзелак многія ледзь «адышлі» ад бабруйскага «свята»

У мінулыя выхадныя ў Бабруйску з помпай прайшоў юбілейны, 10-ы, фестываль-кірмаш «Дажынкі-2006»

Чарговы традыцыйны фестываль-кірмаш "Дажынкі" планавалі правесці ў Бабруйску яшчэ 22—23 верасня, аднак затым перанеслі тэрмін на два тыдні. Прадстаўнікам улады, самадзейным артыстам і сотням міліцыянераў прыйшлося мяняць сваю "праграму", і кажуць, што паведамілі ім пра гэта толькі 20 верасня.

Зрэшты, "праздник состоялся" — не дарэмна ж убухалі ў падрыхтоўку да бабруйскіх "Дажынак" каля 200 мільярдаў рублёў. Гэта з улікам рэканструкцыі горада, пасля чаго, па словах Аляксандра Лукашэнкі, які не прапускае такіх мерапрыемстваў, *"горад абнавіўся, пахарашэў, цэнтр змяніўся да непазнавальнасці, Бабруйск наблізіўся да еўрапейскіх стандартаў"*.

Не ведаем, наколькі Бабруйск стаў горадам з "еўрапейскімі стандартамі", аднак "гудзеў" ён на самай справе два дні — з музыкай, песнямі, гандлёвымі радамі і нават "парасячымі забегамі", дзе, як на іпадроме, можна было рабіць стаўку на парася.

А на афіцыйнай частцы між тым працаўнікам сяла распавядалі, што *"ўжо сама падрыхтоўка да "Дажынак", масавы паўсюдны ўдзел у спаборніцтвах пабуджае хлебаробаў і спецыялістаў працаваць з агеньчыкам, у поўную сілу, бо кожны імкнецца перамагчы, да лепшых вынікаў, бо цвёрда ведае — руплівасць на хлебнай ніве будзе шчодра ўзнагароджана гонарам, павагай і каштоўнымі падарункамі"*.

Праўда, мала ўспаміналі, што перад пачаткам уборачнай у Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання спадзяваліся сабраць столькі ж збожжа, колькі і ў 2004 годзе (7 мільёнаў тон), але не дацягнулі і да мінулагодняга паказчыка ў 6,4 тоны. Усё спісалі на надвор'е — вымярзанне зерневых, перасеў значных плошчаў, дрэнную вясну і летнюю засуху, працяглыя дажджы ў жніўні і верасні.

І ні слова, што бункерная вага — гэта яшчэ не вага амбарнага збожжа. Ад статыстычных лічбаў трэба адкінуць яшчэ як мінімум 15 працэнтаў. Так што вынікі ўборачнай наогул вельмі і вельмі сумныя.

Пра тое, што па выніках 2005 года рэнтабельнасць аграрнай галіны ў мінусах, што затраты на вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі перавышаюць "дывідэнды" ад яе рэалізацыі, што сярэдняя зарплата ў сельскай гаспадарцы амаль удвая ніжэйшая за сярэднюю па краіне, — таксама не афішавалі.

У выхадныя бабруйчане і госці горада з задавальненнем слухалі, што ў 1996 годзе краіна, калі арганізавала свае першыя "Дажынкі", "толькі-толькі пачынала адыходзіць ад глыбокага пастперабудовачнага крызісу". У панядзелак многія ледзь "адышлі" ад бабруйскага "свята"...

Алесь ФЁДАРАЎ.
Фота photo.bymedia.net

БЛИЦ-ОПРОС

«Дожинки»: праздник села или официальная показуха?

Александр ЯРОШУК, председатель Белорусского конгресса демократических профсоюзов:

— Когда я сам работал в органах власти, я и тогда негативно относился к подобным мероприятиям. Считал и считаю, что все это прежде всего связано с политикой и никакого отношения к проблемам села и сельским традициям не имеет. Даже в советские времена не додумывались до такого, потому что та идеология, наверное, знала меру и стремилась во всяком случае не перешагивать грань, после которой забота превращалась в откровенную идеологическую показуху. К тому же очень дорогую показуху. Не было никогда в традициях крестьянства собрать урожай, а часть денег затем просто прогулять. Впрочем, в недемократических обществах всегда любили такие вот праздники урожая и возведенные в культ спортивно-массовые состязания. А белорусских крестьян, которые на самом деле трудятся в поте лица, откровенно жаль. Они чужие на этом празднике жизни, который к тому же устроен за их счет.

Анатолий ЛЕВКОВИЧ, 1-й заместитель председателя Белорусской социал-демократической партии (Грамада):

— Понятно, что "Дожинки" — это пиар-кампания, но, в принципе, для колхозников все-таки это праздник. Признаем это. Другое дело, как мероприятие проводится... Но я не отметаю "Дожинки" целиком и полностью, как делают это некоторые наши оппозиционеры. В любом случае для простого крестьянина, который, как говорят, не вписан в политику, — для него это праздник и отдушина.

Ярослав РОМАНЧУК, экономист:

— У каждой кампании "Дожинок" есть какой-то бюджет на создание дополнительной мотивации своих сотрудников (кроме зарплаты — совместные мероприятия, банкеты, презентации) для того, чтобы сплотить коллектив. Если рассматривать "Дожинки" с точки зрения управления сельским хозяйством в плане создания дополнительной мотивации, то, в принципе, такое мероприятие теоретически возможно. Но поскольку у нас все сельхозпредприятия не являются акционерами одного конкретного общества и не работают как одна команда, то скорее всего эти празднества не более чем вложение денег в пиар и идеологию существующей власти. Они никак не способствуют повышению производительности труда в сельском хозяйстве. Мы в эти "Дожинки" вкладываем десятки и сотни миллионов долларов в год, а власть называет это достижением и заявляет, что хозяйства стали безубыточными. Это говорит о том, что такая модель хозяйствования явно неадекватна текущей ситуации, а "Дожинки" — очень дорогая мина при плохой игре. Если бы после таких мероприятий наши предприятия стали лучше работать, по-современному, улучшили менеджмент, закупили бы новые технологии, конкурировали на внешних рынках — это было бы прекрасно. Но они работают как пешки в системе государственного распределения ресурсов, и поэтому все сводится к тому, чтобы кто-то получил машину, кто-то термос, кто-то чайник, а кто-то и просто грамоту. Это продолжение далеко не самых хороших советских традиций в ситуации, когда параллельно идет увеличение дефицита бюджета при таких вот непомерных затратах на мероприятие, которое никак нельзя обосновать с экономической точки зрения.

Юрий ХАЩЕВАТСКИЙ, кинорежиссер:

— У меня сейчас лежит отснятый материал о деревне, в которой нет ни света, ни телефона. Вот чем надо заниматься, а не ахинеей наподобие наших "Дожинок", когда многомиллионный (в долларах) пиар президенту устраивается за счет вот этих самых людей. Получается, что людей за их же деньги уговаривают, что они хорошо живут. Вот весь смысл этого мероприятия. Но на самом деле живут они чудовищно! В деревнях, где я побывал, беспробудное пьянство, нищета, грязь — это все реалии. А "Дожинки" — официальная показуха и пропаганда. В деревне одна бабушка сказала мне потрясающую вещь. Она сказала: "Никогда такой хорошей жизни не было, как сейчас". А затем долго объясняла, как все плохо у них в деревне. То есть людям в деревне живется плохо, но они знают, что вообще-то в стране жизнь хорошая. И один из примеров такой прекрасной жизни — "Дожинки".

Опрос проводил Алесь СВЕТЛАНИЧ.

АКЦЫЯ

У падтрымку Аляксандра Казуліна...

Да 20 кастрычніка збіраецца працягваць галадоўку ў знак салідарнасці са зняволеным палітыкам Аляксандрам Казуліным жыхар Наваполацка, пенсіянер, сябар Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ Анатоль Кулік.

— Я распачаў галадоўку 4 кастрычніка, калі даведаўся пра зварот Аляксандра Казуліна да грамадзян Беларусі і яго намер распачаць з 20 кастрычніка бестэрміновую галадоўку, — распавёў карэспандэнту "Народнай волі" **Анатоль КУЛІК**. — На працу пакуль хаджу, і там, дарэчы, да мяне ставяцца з разуменнем. Ужываю толькі ваду і "мінералку", ніякай рэакцыі з боку ўлад няма.

Па словах Анатоля Куліка, самаадчуванне ў яго пакуль нармальнае, вопыт такіх галодовак ёсць. У красавіку актывіст Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі два тыдні галадаў, калі вырашыў выказаць пратэст супраць парушэння Канстытуцыі падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

КРЫМІНАЛ

Фінал «пажарнікаў»

Супрацоўнікі дэпартамента па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і тэрарызмам МУС Расіі затрымалі ўдзельнікаў буйнейшага беларускага бандфарміравання, якое больш за дзесяць гадоў тэрарызавала Гомель, — банды "пажарнікаў". У ліку затрыманых — лідэры банды Генадзь Бярэзін, Алег Чыркоў і Вячаслаў Ліценштэйн.

Нагадаем, што групоўка "пажарнікаў" узнікла ў Гомелі ў сярэдзіне 90-х гадоў. У 2004 годзе значную частку яе ўдзельнікаў праваахоўным органам Беларусі ўдалося затрымаць, але 11 чалавек, у тым ліку лідэры групоўкі, здолелі ўцячы. МУС Беларусі падала іх у міжнародны вышук, але была амаль цвёрдая ўпэўненасць, што хаваюцца гомельскія малойчыкі ў Расіі.

Так яно і аказалася. Праўда, гомельскія бандыты пражывалі ў Маскве і вобласці па падробных дакументах.

Зараз вырашаецца пытанне экстрадыцыі затрыманых у Беларусь.

Алег СНОЎ.

АЗБУКА ПОЛИТОЛОГИИ

В поисках харизматического лидера

Летом прошлого года Лукашенко встретился с группой российских журналистов. Интересная получилась пресс-конференция. Выражая в заключении общую точку зрения, некто А.Белокуров, корреспондент газеты "Кузнецкий рабочий", в частности сказал: "Социальное государство Беларусь держится благодаря авторитету, благодаря харизме, благодаря энергии Александра Григорьевича Лукашенко".

"Да, есть такая проблема", — скромно согласился обладатель харизмы и пояснил, что главным условием успеха для руководителя любого ранга является "желание и стремление принимать решение и отвечать за него".

Магический кристалл

А вот в рядах белорусской оппозиции с харизматическим лидером всегда были проблемы, точнее не с ним, а с его отсутствием. И это ни для кого не является тайной. Предложений, в общем-то, масса, и они продолжают поступать. Вот, к примеру, от известного социал-демократа Анатолия Левковича: "Я с 2001 года говорил о том, что надо создать клуб кандидатов в президенты, чтобы все претенденты проявили себя через этот клуб, чтобы на протяжении 5 лет настоящий лидер закалился и набрался сил в этом котле. В принципе, коалиция эту идею взяла, но взяла за год до выборов. А представьте, если бы процесс конкуренции шел на протяжении 5 лет, какой кристалл мог появиться!"

Лично мне, химику по образованию, представить рост подобного кристалла довольно сложно. Однако это мои проблемы, поэтому я переведу стрелку на Макса Вебера, автора столь модного в современной Беларуси политологического термина: "Харизмой следует называть качество личности, признаваемое необычайным, благодаря которому она оценивается как одаренная сверхъестественными, сверхчеловеческими или, по меньшей мере, специфически особыми силами и свойствами, не доступными другим людям".

Есть ли у Лукашенко харизма? Согласно М.Веберу, она у него была, потому что "чистая харизма специфически чужда экономике". Чтобы появился харизматический лидер с джентльменским набором сверхъестественных сил и средств, необходим общественный заказ на лидера подобного типа. В 1994 г. в Беларуси такой заказ, безусловно, существовал. В условиях экономической катастрофы и краха привычного образа жизни большинство граждан оценивало происходящее исключительно на эмоциональном уровне (страх, растерянность и т.п.). Но при наступлении социальной стабильности эмоции уступили место рациональным взглядам, в том числе и на политического лидера.

Политическая жизнь харизматического лидера по М.Веберу редко превышает два года. Он или не оправдывает ожидания, и тогда судьба его печальна, или, добившись стабилизации, вынужден "переосмыслить харизму". Такой "переосмысленный" лидер опирается уже не столько на возбужденное большинство, сколько на рациональных чиновников и силовые структуры. Он вынужден оставить политическую сцену и сесть за рабочий стол. Главной темой теленовостей с его участием отныне становятся привесы и надои, экспорт-импорт и прочие идущие "от жизни" сюжеты.

Что в рейтинге тебе моем?

Значит ли это, что в условиях стабильности у лидера государства не может быть высокого рейтинга? Вот, к примеру, президент России В.Путин. Его рейтинг доверия уже который год превышает планку в 70%. К началу второго срока ВВП не то чтобы освоился, скорее свыкся с ролью хозяина Кремля. Но все равно при очередном появлении на телеэкране он воскрешает в памяти знаменитую грибоедовскую строчку: "А вот и он на цыпочках и небогат словами". Неслучайно известный российский социолог Л.Гудков в свое время заметил: "У власти их (силовых структур. — **С.Н.**) корпоративный президент — бесцветный кабинетный чиновник, лишенный самостоятельности и индивидуальности, Молчалин в роли национального лидера".

А какая харизма была у Сталина, этого паука в норке, из которой он дергал за кадровые паутинки? Однако и сегодня миллионы людей на постсоветском пространстве начинают брызгать слюной в ответ на критические замечания в адрес "отца народов".

Объяснение парадоксов политической популярности следует искать в нашем тоталитарном прошлом, плавно перешедшем в авторитарное настоящее. Как уже отмечалось в статье "Белорусская семья и ее "батька" (см. "НВ" от 16 августа), гражданам с архаичным догосударственным мышлением сложно отделять понятия "государство" и "государственная политика" от личности главы государства. Отсюда "тефлоновость" рейтинга А.Лукашенко и его коллег по СНГ.

Все дело в том, что на Западе большинство граждан смотрят на деятельность политиков через призму своих собственных интересов. Поэтому любое их телодвижение, любое заявление приводит к изменению рейтинга. В Беларуси вместо слова "граждане" правильнее было бы употреблять слово "электорат". Электорат же голосует за того или иного политика не с точки зрения его способности отстаивать интересы голосующего, электорат вручает политику свою судьбу. Каждые президентские выборы у нас судьбоносные. Иными они просто не могут быть.

Но тому, кто связал все свои надежды с одним конкретным человеком, ничего иного не остается, как только молиться на него, молиться и не замечать его текущие оплошности. У лидеров оппозиции низкий рейтинг? А у высших правительственных чиновников рейтинги выше? Как, к примеру, звать-величать председателей палат Национального собрания? Многие ли из читателей "НВ" смогут без запинки ответить на столь, казалось бы, элементарный вопрос? Я лично ответить на него не могу, и это не шутка.

Президент для авторитарного электората представляет не отдельную ветвь власти, он — "наше все". В безальтернативности — его харизма. Это он вывел нас из прошлого, в котором платили 20 долларов в месяц, и привел в настоящее, где и 280 долларов не предел. Он символ порядка и стабильности. От него не ждут великих свершений, вполне достаточно конкретных полезных (желательно ежедневных) дел.

Беларусь — не Африка

Можно ли из вышесказанного извлечь что-то позитивное, или "наше все", в силу самой природы авторитаризма, так и останется на вершине народной популярности? Как долго продлится политическая безальтернативность? Югославский опыт, помноженный на опыт "цветных" революций, не только позволяет надеяться, но и подсказывает направление для конкретной осмысленной работы.

За неимением пророка в своем отечестве обратимся к пророку импортному. По мнению американского специалиста Майкла Макфола, проанализировавшего общие закономерности трансформации режимов в Сербии, Грузии и в Украине, главным условием таких трансформаций была непопулярность руководителя страны. Возможно, это и так, но к Беларуси данное политологическое открытие какое имеет отношение? Отсутствием популярности Лукашенко не страдает.

Не торопитесь с выводами. И Милошевича, и Шеварднадзе восторженные толпы обожателей в свое время носили на руках. Тому, кто замыкает на себе решение всех вопросов, автоматически достается и вся ответственность. Такой лидер превращается в политического велосипедиста: чтобы не упасть, он должен непрерывно крутить педали. В условиях современной Беларуси это означает постоянное повышение уровня жизни населения.

Пока это удается — сформировавшийся политический режим изменить нельзя. Если бы для разработки и осуществления победной стратегии можно было ограничиться группой энергичных умников, располагающих достаточными финансовыми ресурсами, то в любой стране власть менялась бы чаще, чем времена года. В ряде африканских и латиноамериканских государств подобная карусель имела место (особенно в 60-е годы), но вращали ее не умники. Она вращалась из-за отсутствия власти как таковой, поэтому для поднятия из грязи ее жалких останков особых талантов и не требовалось. К Беларуси данный исторический опыт никакого отношения не имеет.

Но вернемся к М.Макфолу: "Лидер может появиться и в последний момент. В Грузии Саакашвили стал необходимым и "единственным в своем роде" после того, как он приказал штурмовать парламент и потребовал отставки Шеварднадзе". А многие ли знали в Югославии Коштуницу до начала президентских выборов? Все победные стратегии в авторитарных странах опирались не на глубокомысленные программы, не на демонстрации альтернатив. "Основной идеей всегда было освобождение от непопулярного правителя", что вполне логично. Раз в свое время с его именем народ связывал все надежды, то для осуществления перемен от носителя прежних надежд необходимо освободиться.

Выращивание магического кристалла — дело достойное. Но какое отношение оно имеет к политике? Проблема Беларуси не в отсутствии яркого оппозиционного лидера, а в отсутствии тех, кто сможет его поддержать в нужный момент. Поддержать не птичками в избирательных бюллетенях, а своими решительными действиями. Выращивать таких активных граждан и означает заниматься политикой.

Сергей НИКОЛЮК, политолог.

КАНФЛІКТ

Беларусь і Італія працягваюць сачыць за лёсам Вікі Мароз

На спецыяльным кансіліуме італьянскія спецыялісты выказаліся за тое, што ў інтарэсах Вікі Мароз, якая зараз праходзіць рэабілітацыю, пакуль не мець кантактаў з сям'ёй Джуста-Барначын. Па крайняй меры, пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН паведаміла намеснік міністра адукацыі Беларусі Таццяна Кавалёва.

Паводле інфармацыі намесніка міністра, Віка праходзіць рэабілітацыю ў сацыяльна-педагагічнай установе. Вяртаць яе ў Вілейку, у школу-інтэрнат, пакуль не плануецца, падкрэсліла Т.Кавалёва. Пазней дзяўчынку могуць накіраваць ва ўстанову сямейнага тыпу "SOS — Дзіцячая вёска". *"Пакуль мы дакладна не ведаем,* — сказала Т.Кавалёва. — *Зразумела, што для дзяўчынкі будзе знойдзена нейкая прымальная форма".*

Паводле яе слоў, урачы прыйшлі да высновы, што працягласць перыяду рэабілітацыі будзе залежаць ад стану дзяўчынкі і ад таго, *"як хутка яна супакоіцца і адаптуецца".* Намеснік міністра падкрэсліла, што *"трывог адносна фізічнага або псіхічнага здароўя дзяўчынкі няма".* Паводле слоў Т.Кавалёвай, працэс рэабілітацыі *"ідзе значна лепш, чым мы чакалі".* У Вікі ўжо пачаліся сістэмныя заняткі, з ёю займаюцца спецыялісты па развіцці маўлення.

Т.Кавалёва таксама паведаміла, што Віка ўжо сустракалася са сваімі сябрамі і ў яе з'явілася сяброўка ў сацыяльна-педагагічнай установе. У дзяўчынкі таксама ёсць *"котка і хамячок, з якімі яна актыўна ваджаецца".*

Суразмоўца падкрэсліла, што Віка нармальна есць. *"Проста першы дзень, калі яны ноччу вярнуліся, дзяўчынка была так змучана ўсім гэтым, што не ела",* — сказала Т.Кавалёва. Яна таксама падкрэсліла, што Італію Віка згадзілася пакінуць *"абсалютна спакойна".*

Суразмоўца зазначыла, што да пытання кантактаў Вікі з італьянскай сям'ёй Джуста-Барначын, магчыма, вернуцца пазней, *"калі ў ім будзе неабходнасць".* Пры гэтым Т.Кавалёва падкрэсліла, што зараз *"абмяжоўваюцца і надалей будуць абмяжоўвацца ўсялякія кантакты з журналістамі, таму што гэта на шкоду дзяўчынцы".* Намеснік міністра падкрэсліла, што Віка *"павінна мець зносіны з людзьмі, якім яна даверае". "Пашыраць штучна кола яе зносін — гэта проста на шкоду",* — лічыць Т.Кавалёва.

Каментуючы заяву міністра адукацыі Аляксандра Радзькова аб магчымасці ўдачарэння Вікі, Т.Кавалёва патлумачыла, што *"міністр меў на ўвазе, што любыя заявы грамадзян будуць разгледжаны".* Пры гэтым яна адзначыла, што працэдура ўсынаўлення вельмі складаная і шматступеньчатая як у Беларусі, так і ў Італіі. *"Хаця я не лічу магчымым і патрэбным абмяркоўваць гэтае пытанне,* — сказала Т.Кавалёва. — *Магчыма, яно выклікае нейкую журналісцкую, спекулятыўную цікавасць, але яно ніяк не ў інтарэсах дзяўчынкі".*

Т.Кавалёва таксама падкрэсліла, што *"ніхто ні ў мінулым, ні цяпер не ініцыяваў працэс удачарэння". "Разглядаюцца гэтыя пытанні толькі тады, калі ёсць ініцыятыва ў выглядзе канкрэтных дакументаў, пададзеных у заяве, і гэтак далей,* — сказала суразмоўца. — *Словы — гэта толькі словы".*

Таццяна КАРАВЯНКОВА.

ТЫМ ЧАСАМ

Віцэ-прэзідэнт Еўрапейскага парламента Марыё Маура накіраваў ліст беларускім уладам, у якім заклікаў прэзідэнта Аляксандра Лукашэнку "ўлічваць жаданне маленькай Марыі (умоўнае імя Вікі Мароз у Італіі) застацца ў Італіі і бязмежную любоў да яе сям'і Джуста-Барначын", паведаміла "Кар'ерэ дэла Сера". М.Маура просіць А.Лукашэнку выказаць міласэрнасць да дзяўчынкі.

ЭПІДЭМІЯ

Гэта не грып, але беражыце сябе!

Па Мінску ходзяць чуткі, што ў сталіцы пачаўся грып. У кожным працоўным калектыве вам раскажуць, што шмат каго з калег ужо напаткала нейкая эпідэмія. Але спецыялісты катэгарычна абвяргаюць гэтыя чуткі.

Сезонны рост захворвання на вірусныя інфекцыі зараз знаходзіцца на леташнім узроўні. Пра гэта БелаПАН паведаміла галоўны тэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Беларусі Людміла Жылевіч.

Паводле яго слоў, гэта будзе зроблена з мэтай стварэння "мультыдысцыплінарных брыгад спецыялістаў" для аказання дапамогі насельніцтву. Як зазначыў П.Рынкоў, многія людзі, якія маюць патрэбу ў псіхіятрычнай і псіхатэрапеўтычнай дапамозе, часта маюць шэраг сацыяльных праблем. Стварэнне такіх брыгад садзейнічае аказанню пацыенту ўсебаковай дапамогі.

Як паведаміў П.Рынкоў, на 1 верасня 2006 года ў Беларусі працавалі 633 псіхіятры, сярод якіх — 94 дзіцячыя, 123 урачы-псіхатэрапеўты (25 дзіцячых) і 51 псіхолаг.

Паводле слоў спецыяліста, зараз распрацоўваюцца новыя штатныя нарматывы псіхіятрычнай службы. Робіцца гэта для павелічэння колькасці спецыялістаў у краіне і зніжэння нагрузкі з псіхіятраў і псіхатэрапеўтаў, якія працуюць. Паводле яго слоў, час знаходжання хворага ў стацыянары псіхіятрычнай клінікі ў апошнія гады зменшыўся з 60 дзён да 32,5, што гаворыць аб павелічэнні абароту ў стацыянарах хворых і росце нагрузкі на спецыялістаў.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ДАРЭЧЫ

У Беларусі захоўваецца тэндэнцыя росту псіхічных захворванняў ва ўсіх узроставых групах. Паказчык першаснага захворвання насельніцтва краіны на псіхічныя расстройствы ўзрос з 40.903 выпадкаў у 2001 годзе да 57.410 — у 2005-м. Агульны паказчык захворвання на псіхічныя расстройствы сярод дарослых у 2005 годзе склаў 171.572 чалавекі (у 2001 годзе — 158.871), сярод дзяцей — 66.769 (60.437). Зараз у Беларусі налічваецца каля 50 тыс. інвалідаў па стане псіхічнага здароўя.

Дядя Ваня

О нем пишут сочинения в местной школе. Его приглашают на все праздники. Такое уважение надо заслужить. И он заслужил...

Мои года — мое богатство

На празднике поэзии в Вязынке я встретил Ивана Афельдера. Он завсегдатай таких мероприятий. Любит стихи, музыку. Сядет рядом со сценой — слух уже плохой — и до конца мероприятия не уходит.

Ивану Ивановичу, кстати, уже 86. А он бодр, худощав. И чарку поднимает, если повод есть. Просто так — не возьмет.

А познакомились мы с ним близко, когда ветеран делал на моей даче печку. Собственно, он на все руки мастер. И с деревом работает, и с камнем, и с железом. С железом особенно. Отец его был кузнецом, и Иван Иванович по его стопам пошел. До пенсии ковал подкову счастья. Он и сейчас не успокоился. Горна и молота с наковальней, конечно, уже нет. Но рубит, косит, козочек и птицу досматривает. В озерцо свое хочет рыбок нужных запустить, вода в нем больно холодная, не все выживают. Просит меня и пчел хороших найти. Благо, ульи есть. И просьбу его я выполнил.

— Есть толковый пчеловод, недалеко живет, — говорю Ивану Ивановичу после концерта.

— Вот и прекрасно, — отвечает ветеран, который еще явно под впечатлением услышанного и думает о своем. — Вот и прекрасно, съездим с ребятами к нему.

И поедет, знаю. Что ему годы, что ему расстояния!

Тетя Владя и березка белая

Мы шагаем с ветераном по аллее, ведущей от музея Янки Купалы к деревне. Неожиданно Иван Иванович останавливается, подходит к белоствольному деревцу, гладит его.

— Я садил березку эту! — не говорит, а кричит мне. — И липы, и ели. Все садил. И сад тот. Из Лошицы привозили деревца, а тетя Владя, жена Янки Купалы, командовала, где копать, что делать. Два года благоустраивали мы эту территорию. Здесь надо было много что сносить, перестраивать. Вот там, где памятник, конюшня была, ниже — свинарник. А дорога вдоль речки петляла. Теперь, видите, какая ровная и прямая. Вот эти руки ее такой сделали. И озерцо мы расширили, и мост добротный построили. Брат мой Николай для него доски пилил. Все вручную мастерили, но добротно делали, знали, какая ответственность!

— А вот этого вы мне, Иван Иванович, не рассказывали, — замечаю я. — И про аллею, и про музей, и про тетю Владю...

— О, тетя Владя хорошим человеком была, — улыбается ветеран. — Я даже с ней танцевал... А вообще, она подарила колхозу машину-полуторку, гармошку, радиоприемник. Она много чего привозила: и соль, которая тогда на вес золота была, и одежду. И кино в сарае показывала. Тетя Владя всегда говорила нам: будете в Минске, заходите, не стесняйтесь. Мы и ночевали у нее. Она приезжала на все праздники, особенно дожинки любила, помогала их организовывать. Заиграет музыка — всех тащит танцевать. Сидит мужик — за рукав и в круг. И я с ней танцевал. Ее образ у меня с белоствольными березками ассоциируется.

Ветеран вздохнул.

— Кстати, дорога, асфальт — все это за ее деньги. Она и колонки в деревне помогла пробить. Ну а музей само собой, там она была очень строга. Мы его несколько раз красили, два раза кровлю перекрывали. То щепой, то соломой.

И Николай мой много труда там вложил.

Служили два брата в пехоте одной

— Кстати, давай зайдем к Николаю, — предложил ветеран. — Ему приятно будет. Он недавно без ноги остался. И рад, когда его навещают.

К Николаю Афельдеру я давно хотел заглянуть. Журналистский интерес тянул. Представляете, два брата всю войну рядышком прошли, в одном окопе сидели, из одного котелка щи хлебали. Случалась беда — поддерживали друг друга. Ранят — перевязывали, ухаживали один за одним. А ранений у них — не счесть, в пехоте ведь были. От Ивана Ивановича я слышал некоторые истории про их боевой путь. Но хотелось, чтобы братья сели рядышком и вспомнили бои-пожарища, дороги пройденные, кровью обогренные. И желание мое наконец сбылось.

После чарки "по случаю" началось известное: а помнишь? Начались воспоминания и горячие дискуссии.

— Под Белой Церковью натаскивали нас, готовили к предстоящим боям. А крещение первое держали под Львовом. Жестокие схватки там были. Но не столько немцы, сколько бандеровцы донимали. От них не было покоя ни днем, ни ночью. Выстояли. А потом — Бессарабия, Румыния, Венгрия, Австрия. Много полегло там наших ребят.

— Мы одно время в разных ротах находились. Но командир как узнал, сразу дал команду сделать так, чтобы мы вместе были. И приказ его незамедлительно выполнили.

— Иван Иванович отчаянный хлопец был, геройский, ничего не боялся. И в разведки с боем ходил, и выполнял ответственные задания, и в атаку первым поднимался. Но больше всего в Будапеште отличился. А там бои были жестокие, в книгах про это хорошо написано. Мы квартал за кварталом отвоевывали. Причем ночью. Днем носа не высунуть, везде снайперы сидят. Стемнеет, ракету в воздух — и вперед. В одной из атак осколок попал Ивану в бедро, а он в пылу боя и не заметил ранения. Да и в госпитале пробыл всего неделю, сбежал.

— А помнишь, Коля, как ты нас вывел из окружения? Казалось, конец нам. Командир ранен и слабым голосом дает приказание тебе: спаси хлопцев, найди брешь... И ты нашел ее.

— А ты думаешь, я забыл, как ты спасал меня и ребят после форсирования Дуная?

Кстати, это незабываемая операция, впечатляющая. Наша артиллерия, наши "Катюши" всю ночь долбили вражеские укрепления на том берегу. Представляете, шесть часов без перерыва! Немцы тоже огрызались. Мы сидели с братом в одном окопе, прижавшись друг к другу. Такой гул! Земля дрожала, вода кипела! А с рассветом началось форсирование реки. Нам командование пообещало: кто первым переправится на тот берег, кто закрепится на нем, тот получит высокие награды. Мы с братом и получили бы, но наш командир погиб.

А нам повезло. Лодку надувную, на которой плыли, пуля пробила у берега. Мы выбрались, а вещмешки утонули, весь наш продуктовый паек ушел под воду. За рекой 12 километров выжженная, безлюдная зона. Ничего живого. А есть хочется. И вот братец мой Ванька находит где-то ульи, приносит мед в сотах, а под мышкой утку держит. Срочно развели костер, стали жарить ее. Подбегает командир и как заорет: "Мать вашу, под суд захотели, врагу наше расположение указываете!" Так что мяса утиного мы не попробовали, а медком побаловались. Всем — ничего, а у меня как разболелся живот. Тут в атаку надо идти, а я подняться не могу. Под руки в бой вели.

— Николая вскоре ранило. Пошли мы на вражеские укрепления, я первым вскочил в немецкую траншею. Оглядываюсь: где брат? А он, как юла, вертится. Снаряд недалеко разорвался, его ранило сильно. Выскочил, за шиворот и в укрытие. Перевязку сделал, санитарам сдал. А на другой день и меня зацепило. С того момента наши пути разошлись. Был бы рядом, может, и не случилась бы со мной такая трагедия в Альпах.

Последний бой — он трудный самый

Недалеко от Вены Иван Афельдер получил приказ. В то время он являлся командиром второго отделения, и вся ответственность за выполнение боевого задания легла на него. Надо было за ночь пройти более трех километров в гору и установить связь с полком. В напарники Иван Иванович взял молодого бойца.

— Все сначала шло нормально, — вспоминает ветеран. — Но затем внизу увидел сполохи, вроде бой идет. Взял аппарат, заземлился, а в трубке тишина. Что делать? Говорю солдатику: держись нитки провода и бегом вниз, связь надо срочно восстанавливать. Но берегись, возможно, немцы перерезали провод. Боец ушел и не возвращается. А уже светать начинает. Принимаю решение идти вперед; приказ есть приказ, и его выполнять надо. Только поднялся, только катушку на плечо закинул, как получил сильнейший удар в спину. Упал, ощупал лопатку, а там кровь теплая. Фашисты, увидев, что я еще шевелюсь, снова открыли огонь по мне. Притаился, а боль невыносимая, кровь уже в сапоги попала. Немцы, видимо, решили, что я мертв. Вижу, не таясь в мою сторону движутся. Их было двое. Тихонько подтянул карабин к себе. Стрелял я метко, одно время снайпером числился. Прицелился и все пять патронов выпустил по цели. Потом мне говорили: ты сразу уложил их. Говорили мои земляки, которые пришли на помощь.

Четвертое ранение было самым сильным. Разрывная пуля разворотила по сути всю правую лопатку, повредила кости. И откуда сила у солдата взялась, чтобы уложить врага да еще до дороги своим ходом добраться? В далеком Ртищево его ставили на ноги, возвращали жизнь руке.

Вот с таким "букетом" фронтовых наград вернулся Иван Афельдер домой. Но ничего, оклемался. И на мирном фронте сполна послужил: дома построил, сады посадил, детей достойных воспитал, внуков дождался.

Мы идем с ним по улице. Все приветствуют ветерана, все кланяются:

— Здравствуйте, дядя Ваня!

Шагает по родной Вязынке заслуженный, уважаемый человек, про которого в школьном сочинении написано: "Мы не имеем права забывать этих простых людей, которые на войне были героями, которые любили и любят свою землю".

Евгений КАЗЮКИН.

Молодечненскій район.

АСОБА

Яе завуць Ефрасіння...

Але не толькі імя родніць гэтую жанчыну з вялікай асветніцай і нябеснай апякункай Беларусі

...Варта было згадаць пра яе — і колішняя выпускніца Мінскага педуніверсітэта Галіна Казак аж заззяла:

— Ефрасіння Георгіеўна Андрэева? Дык гэта ж самая ўлюбёная, незабыўная мая выкладчыца. Бывала, толькі зойдзе ў аўдыторыю, і ўсё азараецца навокал. Чытала ў нас курс педагогікі, чытала — па-беларуску, хаця мы ведалі, што яна расіянка. Студэнты лавілі кожнае слова, яно было поўнае жыццёвай мудрасці і дабрыні. Імі праменіліся яе вочы, усмешка...

Менавіта такой убачыла ўпершыню Ефрасінню Георгіеўну і я, яшчэ не ведаючы, што яна — тая самая знакамітая Андрэева, доктар педагагічных навук, паважаны прафесар і аўтар яркіх, палымяных публіцыстычных артыкулаў у "Народнай волі", напісаных у абарону нашай мовы і незалежнасці, адраджэння нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнай памяці, духоўных скарбаў.

Нельга было не дзівіцца і не захапляцца, што за Беларусь гарой стаіць расіянка родам, якая сустрэлася з нашай краінай ужо ў свядомым узросце. Палюбіла яе з першага погляду — людзей, зямлю, мову. Гэтаксама, як перад прыездам сюды закахалася ў цудоўнага беларускага хлопца, які ў сярэдзіне 50-х вярнуўся разам з маладой жонкай на радзіму з далёкай Уфы. Зараз ён вядомы гісторык, паважаны прафесар Леанід Міхайлавіч Лыч — таксама прыкметная постаць на ніве Беларускага Адраджэння. І таксама актыўны аўтар "Народнай волі". Так самаадданa, верна, нязменна могуць любіць толькі моцныя, цэльныя, узвышаныя натуры. Любіць праз усё жыццё сваіх абраннікаў, сваю справу, зямлю, якая ім радней роднага.

Ефрасіння Андрэева і Леанід Лыч — несумненна сярод такіх людзей. Здаецца, сам лёс парупіўся, каб яны, народжаныя ў процілеглых канцах тагачаснай велізарнай дзяржавы, змаглі сустрэцца і назаўжды стаць побач. Прысвяціць сябе аднаму, дыхаць адным, працаваць дзеля аднаго, не згінацца ні перад якімі выпрабаваннямі.

А выпрабаванняў на долю Ефрасінні Георгіеўны хапіла, ды яшчэ якіх! З самага малку, з першых дзён з'яўлення на свет. Калі ў 1931 годзе ў глыбінным сібірскім сяле пад Омскам, у вялікай і працавітай сялянскай сям'і нарадзілася дзяўчынка (а быў якраз дзень святой Еўфрасінні), бацькі нараклі яе, паводле праваслаўнага календара, Ефрасінняй. Але ў бальшавіцкай дзяржаве ўжо напоўніцу ішла вайна з "опиумом для народа": рушылі храмы, расстрэльвалі святароў, ламалі крыжы, праследавалі вернікаў. Да таго ж пачалася масавая калектывізацыя, шалёная хваля раскулачвання, пад якую трапіў і разгалінаваны род Андрэевых. Іх, абрабаваных і вырваных з родных гнёздаў, ужо гналі па этапе ў страшную невядомасць, і маці несла на руках, заліваючыся слязьмі і прыціскаючы да грудзей, маленькую выгнанніцу, дачушку-немаўля.

Яны былі асуджаныя на пагібель, як і дагэтуль не злічоныя канчаткова ахвяры сталінскага тэрору супраць свайго ж народа, якому шчодра абяцалі "зямлю, фабрыкі і заводы", а насамрэч адабралі ўсё, нават права на жыццё.

...Ды хоць і зрэдку, а цуды ўсё ж здараюцца не толькі ў казках. У тлуме людскога стоўпатварэння на пераправе праз раку мясцовыя сяляне адбілі ў канваіраў паважаную ў акрузе сям'ю Андрэевых, далі ім добрых коней і параілі гнаць іх у розныя бакі, каб збіць са следу дзікую пагоню. Так яны і зрабілі. Рассыпаліся родныя і блізкія, бы гарох з каша, згубіліся, затаіліся на вялізных абсягах і доўгія доўгія гады баяліся нават голас падаць, не ведаючы пра лёс адзін аднаго...

Бацькі Ефрасінні апынуліся разам з малымі дзецьмі ў башкірскіх стэпах, прыбіліся да нейкага калгаса, дзе душыліся непасільнай працай, пухлі з голаду, не раз глядзелі смерці ў вочы, баючыся, што іх расшукаюць. Дзяўчынка падрастала, і маці маліла-заклінала яе: "Не гавары нікому аб тым, хто мы і адкуль, маўчы, забудзься сваё імя. Запомні, цябе завуць Тоня! Паўтарай: Тоня, Антаніна..."

Пра іх хаджэнні па пакутах, якім, здавалася, не будзе канца, хоць раман пішы, хоць сцэнар трылера! Упершыню, як помніцца Ефрасінні Георгіеўне, ёй удалося наталіць голад, умалоўшы адразу цэлы бохан хлеба, толькі з першага свайго дарослага заробку: насуперак усяму адораная, упартая, працавітая дзяўчына Тоня Андрэева здолела атрымаць педагагічную адукацыю і стаць на сваё крыло.

І зараз для Леаніда Міхайлавіча яна — Тоня, Антаніна. Тая ж самая, маладая, прыгожая, святлістая. Вось і не вер ні ў якія наканаванні! Калі зірнуць на траекторыю шляху да іх сустрэчы, то нібыта нябачная, неўсвядомленая магнетычная сіла вяла іх адно да аднаго. Яшчэ не ведаючы нічога пра сваю будучую нарачоную, беларускага хлопца з Уздзеншчыны чамусьці пацягнула за тысячы кіламетраў ад дому ў вайсковую вучэльню. Потым, нібы адчуўшы шостым пачуццём, што невядомай, але прызначанай толькі яму абранніцы тут няма, ён кінуў тую вучэльню і апынуўся ў Башкірыі, стаў студэнтам гістфака Башкірскага універсітэта. Аднойчы зайшоў за нейкай даведкай у райана, убачыў яе і... З таго імгнення і па сёння яны не разлучаліся.

У Беларусі, якая стала для сібірачкі другой радзімай, яна знайшла сябе, сваё шчасце, напоўніцу разгарнула свой талент, хоць і тут не абышлося без перашкод і несправядлівасці. На адказных пасадах у Міністэрстве народнай асветы (тое былі 60—70-я гады мінулага стагоддзя), і потым, ужо дактарам навук і прафесарам, выкладчыкам Мінскага педуніверсітэта, яна ўпарта і плённа рэалізавала сваю задуму — стварыць беларускую школу педагогікі. Сотні і сотні яе гадаванцаў, прысвяціўшых сябе настаўніцтву, узялі з сабою ў дарогу навуку і святло любімай выкладчыцы і старэйшага сябра. Яна вярнула сабе сваё сапраўднае імя — Ефрасіння, стала асветніцай, носьбітам і абаронцай беларускага слова.

Хіба такую жанчыну не назавеш шчаслівай?

Праўда, не так даўно, нібы выпрабоўваючы Ефрасінню Георгіеўну на стойкасць, новая бяда абрынулася на яе: цяжкая хвароба прыкавала да інваліднага крэсла. Але, змагаючыся з нямогласцю, яна па-ранейшаму не губляе прысутнасці духу, цікавіцца ўсім на свеце, радуецца жыццю. Побач з ёю, неадлучна — верны, адданы, надзейны чалавек, любоўю якога яна ўратавана і сагрэта. З ёю — сябры, што не адвярнуліся ў цяжкую часіну і з усёй шчырасцю павіншавалі з юбілейным днём народзінаў: 11 кастрычніка ёй споўнілася 75 год! З ёю — памяць і ўдзячнасць усім людзям, знаёмым і незнаёмым, хто, нярэдка рызыкуючы сабой, дапамагаў выжыць, стаць асобай, быць любімай, патрэбнай, карыснай не толькі блізкім. Адчуваць, што яе помняць былыя гадаванцы і калегі. І што для Беларусі яна не чужынец, а родная дачка.

З юбілеем, дарагая Ефрасіння Георгіеўна! Хай як найхутчэй вернецца да Вас здароўе, а вочы заўсёды праменяць перакананасцю з глыбіні душы: "шчаслівая!"...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

СТРАТЫ

Апошняя роль

На 54-м годзе памерла актрыса Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Тамара Пузіноўская.

Т.Пузіноўская нарадзілася 10 чэрвеня 1953 года ў вёсцы Лань Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. У 1974 годзе скончыла Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут і, як адзначаецца ў некралогу, адразу была залічана ў трупу Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дзе і працавала да апошніх дзён.

Т.Пузіноўская сыграла больш за 20 роляў, стварыўшы шэраг яркіх і разнастайных сцэнічных вобразаў. Найбольш запамінальныя з іх — Кацярына ("Навальніца" А.Астроўскага), Вольга ("Тры сястры" А.Чэхава), Валя Кавалёва ("Характары" паводле В.Шукшына), Цэрэра ("Бура" У.Шэкспіра), Юлія ("Ромул Вялікі" Ф.Дзюрэнмата). Асабліва самабытны талент актрысы раскрыўся ў спектаклях нацыянальнай драматургіі, дзе ярка праявіліся яе майстэрства і здольнасць ствараць дасканалыя вобразы самых розных жанчын. Сярод іх — Нэла ("І змоўклі птушкі" І.Шамякіна), Ліда ("Радавыя" А.Дударава), Маргарыта ("Напісанае застаецца" А.Петрашкевіча), Бона Сфорца ("Чорная панна Нясвіжа" А.Дударава).

Калегі Т.Пузіноўскай падкрэсліваюць, што яна была адной з найбольш яркіх і запатрабаваных актрыс Купалаўскага тэатра, ёй былі падуладныя ролі глыбокага ўнутранага зместу, трагічныя і камедыйныя. Апошняя праца актрысы — роля Жанчыны ў спектаклі "Дом, дзе спяць прыгажуні" Д.Хуана (2001).

ЗЕМЛЯКІ

Дачакалася...

Толькі праз 61 год пасля Другой сусветнай віцябчанку, ветэрана працы Кацярыну Міхайлаўну Паўлаву ўзнагародзілі медалём "За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.". Падчас таго ліхалецця яна служыла ў шпіталі.

У далёкім ужо 1945-м рашэнне аб узнагароджанні К.М.Паўлавай медалём прыняў Вярхоўны Савет СССР. Ды ўзнагарода доўга шукала віцябчанку. Спатрэбілася больш за паўстагоддзя, пакуль дадзеныя аб узнагароджаных не знайшлі ў расійскіх архівах. На мінулым тыдні ў Віцебск спецыяльна прыехаў дарадца амбасадара Расійскай Федэрацыі Канстанцін Кузняцоў, які і ўручыў жанчыне медаль. На ўрачыстай цырымоніі прысутнічалі таксама супрацоўнікі фабрыкі "КІМ", дзе К.М.Паўлава сумленна прапрацавала каля 40 гадоў.

Яна ІЛЬІНА.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Як беларускіх гандбалістаў «адфутбольвалі» за мяжой

У мінулым нумары мы коратка паведамілі, што гандбалісты Брэсцкага клуба імя Мяшкова ледзь выбраліся са Швейцарыі, дзе бралі ўдзел у групавым турніры Лігі чэмпіёнаў. Сёння галоўны трэнер БГК імя Мяшкова Анатоль ДРАЧОЎ падрабязна распавядае пра прыгоды беларусаў у Швейцарыі і Польшчы.

— Перад паездкай мы пачалі афармляць дакументы, і ў польскім консульстве нам сказалі, што калі мы едзем у Швейцарыю, то наяўнасць транзітных віз неабавязкова, — расказвае трэнер. — У 12 чалавек з каманды былі проста польскія візы (паўгадовыя — да снежня), а ў астатніх, у каго былі візы адкрыты на 3 месяцы, тэрмін іх дзеяння скончыўся. І вось пасля кансультацый з польскім бокам новыя візы афармляць мы не сталі: не патрэбны — значыцца, не патрэбны. У Швейцарыю даляцелі спакойна, а вось на зваротным шляху і пачаліся праблемы. Швейцарцаў зацікавіла пытанне: дзе тыя самыя злашчасныя польскія транзітныя візы? Мы паспрабавалі растлумачыць: так, маўляў, і так, нам сказалі, што не трэба. І слухаць ніхто не хацеў. Нас затрымалі, пасля чаго пачалі чакаць прыезду прадстаўнікоў беларускага консульства. Выпусцілі толькі ўвечары па згодзе абодвух бакоў.

— А дзевяць чалавек засталіся ў Швейцарыі...

— Так, дзевяць чалавек разам з юрыстам-перакладчыкам і Мішкам Усачовым, які доўгі час гуляў там і добра ведае нямецкую мову. У рэшце рэшт пасля нейкіх перамоў і гэтую групу адпусцілі ў Польшчу, дзе прыгоды працягнуліся. Ужо польскі бок пачаў заяўляць аб неабходнасці мець транзітныя візы. А справа была бліжэй да ночы. Калі паднялі ўсе дакументы, аказалася, што праўда на нашым баку, але нам заявілі, што мы можам вылецець, але трэба даплаціць яшчэ 1000 долараў за новыя білеты. І паляцім мы не ў Беларусь, а ў Расію. Інакш пагражалі адправіць назад у Швейцарыю. Адным словам, тузалі каманду туды-сюды, і ніхто не хацеў прызнаць сваю віну. Скончылася тым, што пытанне пачало вырашацца на ўзроўні Міністэрстваў замежных спраў, і толькі пасля гэтага нам дазволілі ўзяць білеты праз "Белавія" да Мінска.

— Анатоль Мікалаевіч, а чым гандбалісты ўвесь гэты час займаліся?

— Нічым, чым яны маглі займацца? Добра, што хоць з дапамогай нашага консульства пакармілі. Такая вось эпапея... Напярэдадні чарговай гульні Лігі чэмпіёнаў 7 кастрычніка для спартсменаў гэта быў добры "псіхалагічны пад'ём".

Алесь СІВЫ.

P.S. ***7 кастрычніка ў чарговым матчы Лігі чэмпіёнаў гандбалісты БГК імя Мяшкова прайгралі венгерскаму "Піку" — 24:30.***

«Фітнесам займаюцца нават палітыкі»

14 кастрычніка у Палацы культуры Мінскага аўтазавода пройдзе відовішчнае шоу — "Мемарыял Мікалая Шылы па бодзібілдынгу". Удзел у спаборніцтвах возьмуць лепшыя спартсмены нашай краіны.

Мікалай Шыла — першы савецкі спартсмен, якому ўдалося заваяваць тытул чэмпіёна Еўропы па бодзібілдынгу. Спартыўная кар'ера Мікалая Шылы была кароткай, але яскравай. Акрамя перамогі на чэмпіянаце Еўропы атлет стаў уладальнікам першага Кубка СССР, шматразовым чэмпіёнам рэспублікі. Таксама ў актыве Мікалая Шылы перамогі на прэстыжных міжнародных спаборніцтвах.

"Мемарыял Мікалая Шылы — гэта даніна памяці славутаму беларускаму атлету. Мемарыял праводзіцца з 1989 года і заўжды выклікае вялікую цікавасць у гледачоў. Усіх сакрэтаў пакуль раскрываць не буду, але акрамя якаснага свету, добрай музыкі і адданай працы саміх атлетаў гледачоў чакае шмат сюрпрызаў", — гаворыць дырэктар Беларускай федэрацыі бодзібілдынгу і фітнесу Кірыл Дубкоў.

Адзін з удзельнікаў будучых спаборніцтваў майстар спорту, шматразовы чэмпіён Беларусі па бодзібілдынгу Дзмітрый Рамейка зазначае, што цікавасць да бодзібілдынгу і фітнесу ўзрастае: "З кожным годам фітнес і бодзібілдынг становяцца ўсё больш папулярнымі сярод нашых людзей. Паверце, у трэнажорныя залы людзей ходзіць болей, чым на стадыёны, каткі і тэнісныя корты. Таму што кожны з нас хоча добра выглядаць, мець прыгожае атлетычнае цела. Наш від спорту не танны, але прафесіяналамі становяцца не ўсе. У асноўным людзі займаюцца для сябе".

Дзмітрый Рамейка працуе інструктарам па бодзібілдынгу ў адным са сталічных клубаў: *"Кліентура розная. Прыходзяць спартсмены з іншых відаў спорту — футбалісты, хакеісты. Даводзіцца працаваць з зоркамі айчыннага і расійскага шоу-бізнесу. У свой час пад маім кіраўніцтвам займаліся Аляксей Булдакоў і Аляксандр Цэкала. Беларускія палітыкі, не буду называць канкрэтных прозвішчаў, таксама ў мяне займаюцца. Ім жа, можа, больш за іншых хочацца выглядаць добра".*

Кошт абанементаў у розныя сталічныя фітнес-клубы вагаецца: *"Месячны абанемент можа каштаваць ад 30 да 150 долараў. Калі кліент хоча, каб з ім працавалі індывідуальна — трэба даплачваць.*

"Калі ў каго ёсць жаданне заахвоціцца здаровым ладам жыцця — калі ласка, прыходзьце на "Мемарыял Мікалая Шылы". Абяцаю, будзе цікава", — гаворыць Кірыл Дубкоў.

Віталь ГАРБУЗАЎ.
Фота
Юрыя ДЗЯДЗІНКІНА.

СУДЬБА

Поборол!

Бронзовому призеру Олимпиады 2000 года, борцу греко-римского стиля в весовой категории до 130 кг Дмитрию ДЕБЕЛКО сделали операцию по перасадке почки.

Наша газета очень много писала о судьбе Димы. Два года назад он рассказывал: *"Когда год назад я плохо себя почувствовал, мне никто не верил. Я сказал тренеру, что плохо себя чувствую, тот мне ответил: "Ну не прикидывайся, Дима, не ленись". Становилось все хуже и хуже. Я не выдерживал нагрузок, часто случались судороги. Дадут витамины, что-то еще — вроде отпускает. Тренировался до потери пульса. На медосмотрах неважные анализы тоже не принимали в расчет. Отмахивались ("хочешь — ложись в больницу, не хочешь — не надо"), списывали на усталость, недосыпание. Все оставались равнодушными, провести полное медобследование ни у кого даже желания не возникало. Когда оставалось два месяца до чемпионата страны, моя мама настояла, чтобы я лег в 4-ю городскую больницу, где в ноябре 2003 года врачи поставили диагноз "гломерулонефрит". Одно из самых агрессивных заболеваний почек, считается неизлечимым, о случаях излечения не известно. Если не делать гемодиализ, наступает летальный исход. Три раза в неделю хожу на гемодиализ — это четыре часа под капельницей, когда кровь чистится без участия почек. И это не месяц или год, а до конца жизни. Насколько я понял, болезнь начала развиваться оттого, что попала инфекция. Организм боролся с ней, когда мне было плохо, а я в это время боролся на ковре. Если бы меня обследовали после первых же жалоб..."*

Дима начал терять в весе, его "сняли" со ставки в Министерстве спорта, многие бывшие друзья тут же забыли попавшего в беду товарища. Рядом оставались только близкие и любимая жена Наталья. Дмитрию нужна была операция. Первый вариант — это операция по пересадке почки, которую сделали бы в Минске бесплатно. Но ожидать донора с подходящим органом можно вечность. Второй вариант — сделать операцию в Москве с использованием стволовых клеток. Но такие операции считались экспериментальными, хотя в Москву он все же собирался.

Дмитрий: — У меня поднялась температура, а поэтому в Москву поехал только мой врач из Республиканского центра спортивной медицины Павел Малашевич. Оказалось, что операция в Москве по пересадке почки ничем не будет отличаться от такой же в Минске. Разница лишь в том, что в Первопрестольной за операцию и реабилитационный период нужно будет заплатить, по-моему, около 70 тысяч долларов.

Наталья: — Все оставалось на месте. То же плохое самочувствие, тот же гемодиализ... Я написала о Диме в газету "Лечебные письма" и получила из России очень много писем, советов из народной медицины. Боже, что только нам не предлагали! Рецепты, советы по биодобавкам, одна женщина даже прислала Библию и написала: "Молитесь!" Но никто не сказал в своем письме: "Я вот этим средством вылечился". Правда, одна женщина все же откровенно написала (я это письмо Диме даже не показывала): "Не надейтесь ни на какие травки, вам поможет только пересадка почки. Моей дочке сделали такую же, и теперь у нее совсем другая жизнь. Если что, обращайтесь..." Тогда я поняла, что другого выхода просто нет. А ситуация с Димой все ухудшалась и ухудшалась. Этим летом ему стало совсем плохо, он не мог подняться пешком на второй этаж, трудно было ходить. Начались отеки, практически перестал есть и пить, капельницы из-за веса мужа (а он весит за 100 килограммов) уже не помогали выводить жидкость из организма. Увеличивать время гемодиализа было тоже небезопасно — это огромная нагрузка на сердце. Иногда Дима приходил после капельницы домой, садился на диван и даже не мог раздеться. Было жутко и больно!

Дмитрий: — Ситуация была на самом деле критическая, и, в конце концов, моя мама сказала, что отдаст мне свою почку. Я лег на неделю в больницу для медицинского осмотра и подготовки к операции, затем туда отправилась и мама. Вышел из больницы я раньше нее, на следующий день после обеда звонок из отделения пересадки почки 4-й больницы Минска: "Мы готовы сделать операцию по пересадке почки, есть донор, компьютер просчитал, что его орган вам подходит". Спрашиваю: "Сколько у меня есть времени подумать?" — "Вы взрослый человек, — говорят, — у вас практически нет времени на раздумье". Я сразу же позвонил Наташе...

Наталья: — Звонит мне на работу и сообщает такую новость. Я тоже понимала, что времени нет, но меня прямо-таки какой-то паралич охватил. Единственное, что сказала мужу тогда: "Соглашайся". И Дима поехал. Отвез сына к моей маме, а сам отправился в больницу. Меня всю колотило, на работе я не находила себе места... От одного донора можно пересадить две почки, и первому операцию по пересадке правой почки делали молодому человеку Денису — он находился в такой же ситуации, как и Дима. А я думала: "Боже! Врач же, наверное, устанет, как он затем ночью прооперирует мужа?"

Дмитрий: — Слава богу все прошло успешно. В 22.30 началась моя операция, около трех часов ночи ее закончили.

Наталья: — И в этот день, когда заново "ожил" Дима, у меня еще родилась и крестница.

— Вам не говорили, кто донор?

Наталья: — Нет, об этом не говорят. Сказали только, что это молодой человек тридцати лет из Могилева, с которым произошел несчастный случай — он погиб в результате черепно-мозговой травмы. Мы хотели написать благодарственное письмо его родственникам, которые разрешили пересадку органов парня, но адрес нам не дали. Не положено. Но мы от чистого сердца благодарим и кланяемся в ноги этим людям.

Дмитрий: — Операция проходила в 4-й больнице, оперировал сам заведующий отделением Леонид Петрович Ткачев. Правда, на следующий день пришлось делать еще одну. Утром я как-то неудачно чихнул, чувствую, что в области почки что-то как будто лопнуло. Наверное, тромб, пошла кровь, живот раздулся до неузнаваемости. В 10 утра — вторая операция. Сняли швы, почистили, "запаяли" тромб — все в порядке. Пролежал в больнице недели две, когда выписывали, давали разные советы, сказали, что с организмом надо разговаривать, чтобы он принял инородное тело как свое. Теперь у меня три почки (старую ведь не удаляли) — я суперчеловек. *(Смеется.)*

Наталья: — Над Димой в больнице все смеялись, потому что он постоянно хотел есть. Перед операцией как раз обед приготовил, а тут звонок: "Операция, ничего есть нельзя..." После нее тоже ничего не давали есть четверо суток — только жидкость и бульончик. Рассказывали, что Дима даже во сне про еду бредил — так он хотел что-нибудь "укусить".

— С Министерством спорта какие-то контакты поддерживаете?

Дмитрий: — Гостренер Александр Барауля помогал мне оформлять группу, и с апреля я получаю пенсию по инвалидности. Но он, наверное, не по работе помогал, а просто по-человечески. А Министерство спорта... Если бы можно было написать, что все они... Но так писать не надо. Счастья им всем в личной жизни.

Наталья: — Сейчас Димка у меня "домохозяй". Мы уже гуляем вместе на улице, хотя большие нагрузки пока запрещены. Реабилитационный период — год, поэтому нельзя поднимать тяжести, необходимо соблюдать диету, но уже не надо ездить на этот треклятый гемодиализ, когда три года по три раза в неделю тебе вставляли в вену иголку величиной с шариковый стержень! Сейчас жизнь поменялась, Дима будет восстанавливаться, а уже затем подумаем, как нам дальше жить и работать. Будем надеяться, что сейчас в нашей жизни началась светлая полоса, которую мы так долго ждали. Мне даже вещий сон приснился. Лечу я с кем-то в машине по облакам, а на все небо — огромные кремлевские куранты. И я кричу своему попутчику: "Мы не можем ехать, я должна услышать, когда пробьют куранты, чтобы загадать желание". И машина остановилась. Затем поехала назад, начали бить часы, а я загадала желание — чтобы Димка выздоровел. Куранты пробили два раза. И через два года мужу сделали операцию. А когда ему сделали операцию, мне Дима дважды мертвым приснился. Говорят, теперь он всех нас переживет!

Алесь СИВЫЙ.
Фото
Юрия ДЕДИНКИНА.

ЗВЕЗДЫ

Евгений Плющенко провел в Минске один день

В белорусской столице прославленный фигурист успел попариться в бане, дать мастер-класс юным фигуристам и подарить одному столичному кафе название коктейля.

«Я увидел трех перспективных девочек»

Основная цель приезда в Минск победителя зимней Олимпиады в Турине — урок фигурного катания для ребятишек детско-юношеской спортивной школы Минска по фигурному катанию. Евгений Плющенко уже дал несколько подобных мастер-классов в российских городах. А 4 октября заглянул в Минск. В белорусской столице спортсмен оказался впервые. И поскольку прилетел в наш город поздно вечером 3 октября, а 4-го практически весь день провел на льду, впечатления от Минска выразил одним предложением: *"Город чистый, очень красиво подсвечены дома на центральном проспекте, хорошие дороги".*

Мастер-классы прославленный фигурист дает бесплатно. И не только в Минске, куда спортсмен приехал при поддержке чая Dilmah. Гастролируя по странам СНГ и городам России с собственным шоу "Ледовый автограф", Евгений Плющенко обязательно перед выступлением дает уроки мастерства местным ребятишкам. И тоже бесплатно. *"Как и каждому человеку,* — скромно замечает Плющенко, — *мне тоже нужны деньги. Но на мастер-классах я не зарабатываю. Я зарабатываю на своих показательных выступлениях".*

В Минске Евгению Плющенко показали 15 юных белорусских дарований. *"Я увидел трех перспективных девочек,* — поделился позже своими впечатлениями олимпийский чемпион. — *Еще две девочки хорошо вращались".* Но, по мнению спортсмена, в Беларуси мастер-классы нужны в первую очередь тренерам.

"К сожалению, ваши тренеры не идут в ногу со временем, — критиковал белорусскую школу фигурного катания прославленный фигурист. — *А дети хорошие, хотя и занимаются всего-то 45 минут в день. Но это не тренировки. 45 минут могут кататься профессионалы. Детям нужно как минимум заниматься по 3 часа в день на льду: по полтора часа утром и вечером, а также полтора часа уделять общей физической подготовке. Значит, работать надо 5 часов в день. Тогда будут результаты".* Если бы у Плющенко была своя школа фигурного катания, то, признался спортсмен, нескольких белорусских девочек он взялся бы тренировать. *"Но пока я не решил, чем буду заниматься дальше — останусь в любительском спорте или уйду в профессионалы,* — сказал спортсмен. — *Сегодня я получаю очень много предложений от устроителей ледовых шоу. До декабря у меня расписан рабочий график. Меня ждут любители фигурного катания в Японии, Китае, Франции. А из Шри-Ланки я вообще получил приглашение поработать".*

«В Минске у меня много знакомых»

В белорусской столице Евгений Плющенко остановился в единственном четырехзвездочном отеле города. Багаж спортсмена состоял из одной небольшой дорожной сумки. Еще накануне прибытия в Минск из Москвы организаторы приезда Плющенко заказали для спортсмена баню. Хотя Евгений и признавался позже, что в белорусской столице у него много знакомых, парился он в одиночестве.

— Я вообще люблю побыть один, — откровенничал спортсмен. — *По натуре я не тусовщик и не переношу, когда вокруг меня много народу. Я вижу по двадцать тысяч зрителей на стадионах. После этого мне хочется часто побыть одному. Но участие в различных шоу и проектах, будь то "Звезды на льду" или чайная дегустация, — неотъемлемая часть жизни публичного человека. Мне это нравится.*

В Минске, к слову, в t-баре супермаркета "Гиппо" Евгению Плющенко предложили выбрать самый вкусный коктейль и назвали его именем прославленного фигуриста.

Еще спортсмен признался, что проблемы белорусского фигурного катания он обсуждал по телефону с Александром Лукашенко. И не опроверг информацию, что в его телефонной книжке есть номера Владимира Путина и Валентины Матвиенко.

«В шоу «Звезды на льду» я сам попросился в ведущие»

Евгений Плющенко — звезда номер один в фигурном катании. Пересчитать все его награды сложно. Семикратный чемпион России, пятикратный чемпион Европы, трехкратный чемпион мира, олимпийский чемпион Турина-2006. А сколько у спортсмена серебряных и золотых медалей! Свою первую победу юный Женя Плющенко одержал в 7 лет. И очень жалеет, что не сохранил свои самые первые коньки — железные "Ботасы". А за всю спортивную карьеру Плющенко "скатал" 19 пар коньков.

Сегодня прославленного фигуриста хотят заполучить не только организаторы ледовых шоу в разных странах мира. Плющенко приглашают сниматься в сериалах, участвовать в различных телевизионных проектах. Открытому, доброжелательному, без "звездных" замашек спортсмену чаще приходится отказываться от заманчивых предложений. Не устоял Плющенко только перед предложением Первого российского канала. Он принял участие в съемках масштабного и зрелищного шоу "Звезды на льду".

"Я сразу сказал, что буду ведущим, — раскрыл Плющенко некоторые закулисные тайны одного из самых рейтинговых телепроектов. — *Зачем мне соревноваться? Все, что мог, я уже выиграл. А быть ведущим мне нравится. Это что-то новое".*

Согласившись вести ледовое шоу, фигурист взял несколько уроков сценической речи и актерского мастерства. Он не скрывает, что все роли в шоу расписаны, а сцены отрепетированы. Тем не менее много в проекте и импровизации.

Российская пресса не раз писала, что "Звезды на льду" стали самым дорогим шоу в истории российского телевидения. Съемки всего одной программы стоят более миллиона долларов. Самое дорогое "удовольствие" — это аренда льда, который надо поддерживать в идеальном состоянии. Плюс костюмы участников, декорации, техника.

"Сложнее всех на шоу Татьяне Анатольевне Тарасовой, — улыбается Евгений Плющенко. — *Она главный судья. А ребята все молодцы! Сейчас у них такая идет борьба!"*

Плющенко не признается, за какую пару болеет. Говорит только, что судьи предвзято относятся к дуэту Бережная/Носик. Зрители это чувствуют, и уже четыре раза спасали пару от вылета их шоу. А уж в чей адрес Евгений не скупится на комплименты, так это в адрес соведущей шоу Ирины Слуцкой.



— *Ролик, который крутит первый канал,* — говорит Плющенко, — *мы сняли с Ириной за 7 минут. Хотя до этого ни она, ни я не выступали в паре. Но все это заслуга Ирочки. Она такая молодец! Такая трудолюбивая, открытая девушка!*

...Возможно, Евгений Плющенко очень скоро снова посетит Минск. Но тогда уже он не ограничится встречами с юными фигуристами и журналистами. Возможность увидеть Евгения Плющенко на льду появится у всех белорусских любителей фигурного катания. Сейчас в России готовится еще одно шоу — "Ледовый экстрим-2006". На коньки наряду с известными фигуристами встанут акробаты, артисты, каскадеры. Планируется, что гастроли шоу пройдут по разным городам России и СНГ.

Так что до встречи, Евгений Плющенко!

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Я не стаміўся»

Юрый Пунтус спакойна ставіцца да цяперашняга сумяшчэння пастоў галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай Беларусі і мінскага клуба МТЗ-РІПА.

"Мая работа ў клубе ніяк не ўплывае на работу ў зборнай, — заявіў трэнер на прэс-канферэнцыі ў Беларускай федэрацыі футбола. — *Так, я не магу паехаць на якісьці матч расійскага чэмпіянату, дзе выступаюць члены нашай зборнай, але ёсць тэлевізар, дый пасля кожнага матча я тэлефаную кожнаму гульцу. Калі і ёсць нейкія негатыўныя моманты, то толькі ў клубе, кіраўніцтва якога пры жаданні можа прад'явіць мне прэтэнзіі, калі іншым разам я пакідаю каманду пад апекай памочнікаў, а то еду разам з імі".*

Галоўны крытэрый, паводле слоў Ю.Пунтуса, — вынік. *"Калі, скажам, МТЗ-РІПА заваёўвае залатыя медалі нацыянальнага чэмпіянату, а зборная выходзіць у фінальную частку чэмпіянату Еўропы, наўрад ці ёсць сэнс казаць пра шкоду сумяшчэння. Зразумела, бывае цяжка, няма калі дух перавесці. Але, улічваючы амбіцыі і ўзрост (8 кастрычніка трэнеру споўнілася 46 гадоў), я хачу даказаць, што сумяшчэнне нікому не перашкаджае. Я не стаміўся",* — заявіў Ю.Пунтус.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

ФУТБОЛ

Адстаўка

Людас Румбуціс больш не з'яўляецца настаўнікам "Дарыды", каманды Мінскага раёна.

Румбуціс напісаў заяву аб звальненні па асабістым жаданні, і цяпер ён будзе дарадцам старшыні праўлення клуба. Пра гэта паведаміла газета "Прессбол".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 11.10.2006 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №